

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №3
Лістапад 2019

## Пачалася II чвэрць 2019-2020 навучальнага года

Вельмі хутка закончыліся восеньскія канікулы. Асабіста ў нас, вучняў 8 класа, яны пакінулі вельмі прыемныя ўспаміны, бо прайшлі цікава і насычана. Чым больш усяго яны запомніліся, мы спыталіся ў некаторых вучняў нашай школы.

Канікулы пачаліся з разумовай працы - алімпіяды па матэматыцы. “Задачы на алімпіядзе былі цяжкімі, але цікавымі. На мой погляд, матэматыка вельмі захапляльны прадмет, таму заданні я рашаў з задавальненнем”, - паведаміў вучань 9 класа Глеб Епіфанаў.







У суботу 2 лістапада у школе прайшла акцыя “Чысты двор”, падчас якой была добраўпарадкавана тэрыторыя вакол установы.

Падчас восеньскіх канікулаў адбыліся спаборніцты “Баскетбольны снайпер”, у якіх прынялі ўдзел вучні 5-9 класаў. Вынікі спаборніцтваў:

**1 месца – Халееў Дзмітрый,**
вучань 8 класа



**2 месца – Маглена Максім,**
вучань 8 класа



**3 месца** падзялілі паміж сабой

**Епіфанаў Глеб,**
вучань 9 класа



**Шэцко Цімафей,**
вучань 5 класа



## Віншуем пераможцаў !!!!

Пачалася другая чвэрць, і мы спадзяёмся, што яна пройдзе таксама яскрава і хутка, як праляцелі незабыўныя восеньскія канікулы.

# Наведванне раённага рэсурснага цэнтра па бяспецы

Усе мы жывем у сучасным свеце, дзе, на жаль, існуе шмат крыніц небяспекі, якія пільнуюць нас на жыццёвым шляху. Для таго каб засцерагчы сябе ў той ці іншай складанай сітуацыі ці наогул яе пазбегнуць, неабходна ведаць, якія бываюць надзвычайныя сітуацыі і як сябе паводзіць, калі здарылася бяда.

Менавіта такую мэту ставілі перад сабой вучні 5-9 класаў перад тым, як наведаць раённы рэсурсны цэнтр па бяспецы.

У рэсурсным цэнтры нам расказалі, як паступаюць званкі-выклікі на кароткія нумары службаў экстранай дапамогі. На пульце запісваецца размова, хто і адкуль тэлефануе. А за безпадстаўны выклік падманшчыка чакае штраф.



Нам яшчэ раз нагадалі нумары, па якіх можна выклікаць дапамогу з гарадскога і сотавага тэлефона: 101, 102, 103, 104 і 112. Мы і самі паспрабавалі патэлефанаваць.

Напрыканцы мы замацавалі атрыманыя веды пры рашэнні розных сітуацый, якія могуць здарыцца з кожным (пажар, узгаранне электрапрыбораў і інш) з дапамогай інтэрактыўнага планшэта.





# Наша творчасць

“Свет маіх захапленняў” – пад такой назвай прайшоў занятак, падчас якого вучні 5-9 класаў мелі магчымасць расказаць пра свае захапленні і прадэманстраваць некаторыя з іх.




Свет маіх захапленняў



Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.